ЗАЦВЕРДЖАНА

Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
21.08.2023 № 273

**Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» для VI–X класаў першага аддзялення спецыяльнай школы, спецыяльнай школы-інтэрната з рускай мовай навучання і выхавання для вучняў з інтэлектуальнай недастатковасцю**

## ГЛАВА 1
## АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Дадзеная вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» (далей – вучэбная праграма) прызначана для VI–X класаў першага аддзялення спецыяльнай

школы, спецыяльнай школы-інтэрната з рускай мовай навучання і выхавання для вучняў з інтэлектуальнай недастатковасцю.

2. Дадзеная вучэбная праграма разлічана на 315 гадзін: VI–IX класы – па 70 гадзін у кожным класе (2 гадзіны на тыдзень), X клас – 35 гадзін (1 гадзіна на тыдзень).

Колькасць гадзін, прадугледжаных у главе 2 дадзенай вучэбнай праграмы на засваенне вучэбнага матэрыялу адпаведнай тэмы, з'яўляецца прыкладнай і залежыць ад выбару настаўнікам метадалогіі навучання і выхавання, адпаведных відаў дзейнасці, разумовых і фізічных магчымасцей вучняў. Настаўнік мае права пераразмеркаваць колькасць гадзін на вывучэнне пэўных тэм у межах гадзін, адведзеных на авалоданне прадметам на працягу навучальнага года, аднак пры гэтым на кожным уроку неабходна надаваць увагу ўсім відам маўленчай дзейнасці: чытанню, гаварэнню, аўдзіраванню і пісьму.

3. Мэта – фарміраванне ў вучняў камунікатыўнай кампетэнцыі, гэта значыць навучанне іх разуменню беларускага маўлення, гаварэнню, чытанню і пісьму па-беларуску. Навучанне вучняў практычнаму карыстанню беларускай мовай з улікам іх пазнавальных магчымасцей ажыццяўляецца для дасягнення вучнямі такога ўзроўню моўнай і маўленчай падрыхтоўкі, які дапаможа ім паспяхова адаптавацца ў сацыяльным асяроддзі.

4. Задачы:

выпрацоўваць трывалыя навыкі пісьма і маўлення на аснове вывучэння графіка-арфаграфічнай і лексіка-граматычнай сістэм сучаснай беларускай мовы;

фарміраваць камунікатыўныя ўменні ў розных сферах і сітуацыях зносін, у тым ліку звязаных з працоўнай дзейнасцю;

фарміраваць асобасныя рысы вучняў з інтэлектуальнай недастатковасцю сродкамі беларускай лексічнай сістэмы;

садзейнічаць сацыяльнай адаптацыі вучняў шляхам арыентацыі зместу навучання на іх будучае самастойнае жыццё праз беларускамоўную тэкставую інфармацыю.

5. Рэкамендаваныя формы і метады навучання і выхавання з улікам узроставых і псіхафізічных асаблівасцей вучняў, змястоўнага і працэсуальнага кампанентаў вучэбнага матэрыялу: славесныя інструкцыі, эўрыстычныя гутаркі з вучнямі, сюжэтна-тэматычныя ўрокі; практыкаванні па замацаванні навыкаў пісьма і граматычных правіл, вусныя і пісьмовыя пераказы мастацкіх твораў, пісьмовыя работы, групавая форма правядзення заняткаў па вусным маўленні.

Выбар форм і метадаў навучання і выхавання вызначаецца настаўнікам самастойна з улікам узроставых і псіхафізічных асаблівасцей вучняў.

Дадзеная вучэбная праграма складзена паводле дыдактычных прынцыпаў даступнасці, паслядоўнасці, сістэмнасці, мэтазгоднасці, адэкватнасці, навучання ад простага да складанага, калі падача новага матэрыялу базіруецца на ўжо вядомым і ў цеснай сувязі з ім. Матэрыял вучэбнага прадмета «Беларуская мова» падабраны з улікам міжпрадметных сувязей.

Змястоўны матэрыял падабраны з улікам яго даступнасці для зносін і атрымання інфармацыі ў разнастайных жыццёвых сітуацыях і падаецца паводле наступных аспектаў: адпаведнасць матэрыялу разумовым і фізічным асаблівасцям вучняў; лінейна-канцэнтрычнае размяшчэнне матэрыялу на працягу ўсяго перыяду навучання; паслядоўнае практычнае засваенне навуковых паняццяў; сістэмнае размяшчэнне матэрыялу, што забяспечвае ўсвядомленае яго ўспрыманне, разуменне, запамінанне для далейшага выкарыстання ва ўласнай дзейнасці; змястоўная рэалізацыя сістэмы маральных, этычных і эстэтычных паняццяў.

6. Асноўныя патрабаванні да вынікаў засваення зместу вучэбнага матэрыялу выражаюцца ў тым, што ў вучняў будуць сфарміраваны: веды пра адметнасць беларускай мовы на розных узроўнях – фанетычным, граматычным, лексічным; пра сферы ўжывання беларускай мовы; уменні выкарыстоўваць моўныя адзінкі ў адпаведнасці з нормамі сучаснай беларускай літаратурнай мовы. Вучні павінны авалодваць мовай у працэсе маўленчай дзейнасці. Асноўную ўвагу неабходна звяртаць на фарміраванне і развіццё ў школьнікаў чатырох відаў маўленчай дзейнасці: слухання (аўдзіравання), гаварэння, чытання, пісьма.

## ГЛАВА 2
## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА

VI клас

Паўтарэнне (6 гадзін)

Беларуская мова – мова народа Беларусі. Этыкетныя словы і выразы.

Алфавіт. Гукі і літары (апостраф).

Словы-прадметы, словы-дзеянні, словы-прыметы.

Вялікая літара ў пачатку сказа. Знакі прыпынку ў канцы сказа.

Выказванне прабачэння, просьбы з ужываннем этыкетных формул[1].

[1] Тут і далей заданні і віды дзейнасці творчага характару, якія прапаноўваюцца вучням у залежнасці ад іх індывідуальных магчымасцей і ўзроўню падрыхтаванасці.

Маўленне (12 гадзін)

Мова і маўленне. Вуснае і пісьмовае маўленне. Дыялог і маналог. Выкарыстанне мімікі і жэстаў у зносінах.

Фанетычныя асаблівасці беларускай мовы:

гукі [г], [ч], [р];

гук [ў] і літара;

гукі [дз'], [дж] і іх абазначэнне дзвюма літарамі;

гукі [д]-[дз'], [т]-[ц'] і іх абазначэнне літарамі;

спалучэнне шч у беларускай мове.

Графічныя асаблівасці беларускай мовы:

літара і;

апостраф.

Словараспазнавальная роля гукаў і літар.

Складанне слоў з гукамі-літарамі, якія адлюстроўваюць фанетычныя і графічныя асаблівасці беларускай мовы[1].

Удзел у кароткім дыялогу са сваімі аднакласнікамі.

Гукі і літары (10 гадзін)

Галосныя гукі і іх літары.

Падзел слоў на склады і для пераносу. Роля галосных у падзеле слоў. Правілы пераносу слоў.

Націск. Словараспазнавальная роля націску.

Правапіс слоў з літарамі о, э–а. Правапіс слоў з літарамі е, ё–я.

Зычныя гукі і іх літары. Цвёрдыя і мяккія зычныя гукі. Абазначэнне мяккасці зычных гукаў на пісьме літарамі е, ё, і, ю, я і мяккім знакам. Зацвярдзелыя зычныя гукі [дж], [ж], [ш], [ч], [р].

Звонкія і глухія зычныя. Правапіс слоў з парнымі зычнымі гукамі.

Падоўжаныя зычныя гукі. Абазначэнне іх падвоеным напісаннем літар.

Складанне слоў з націскам на першым, другім, трэцім складах (па малюнках)[1].

Ужыванне ў маўленні слоў, якія дэманструюць словараспазнавальную ролю націску.

Слова (21 гадзіна)

Значэнне слова (3 гадзіны)

Словы, блізкія па значэнні. Словы, процілеглыя па значэнні. Карыстанне тлумачальным слоўнікам.

Словы як назвы прадметаў, дзеянняў, прымет. Распазнаванне іх па значэнні і пытаннях.

Часткі слова (5 гадзін)

Склад слова. Вызначэнне частак слова.

Корань. Роднасныя (аднакаранёвыя) словы. Адрозненне роднасных слоў ад форм слова.

Канчатак і яго роля ў сувязі слоў.

Суфікс. Утварэнне слоў з дапамогай суфікса.

Прыстаўка. Утварэнне слоў з дапамогай прыстаўкі.

Назоўнік (6 гадзін)

Назоўнікі, якія адказваюць на пытанні хто? і што? Адзіночны і множны лік назоўнікаў. Род назоўніка.

Напісанне вялікай літары ў імёнах і прозвішчах людзей, імёнах па бацьку, мянушках жывёл, назвах краін, гарадоў і вёсак, рэк і азёр.

Прыметнік (3 гадзіны)

Роля прыметнікаў у мове. Род і лік прыметніка.

Сувязь прыметніка з назоўнікам.

Дзеяслоў (3 гадзіны)

Роля дзеясловаў у мове. Адрозненне прадметаў па дзеянні. Род і лік дзеяслова (некаторыя выпадкі). Назіранне за змяненнем роду і ліку дзеяслова ў маўленні.

Прыназоўнік (1 гадзіна)

Агульныя звесткі. Правапіс прыназоўнікаў з назоўнікамі.

Вызначэнне па пытаннях слоў розных часцін мовы[1].

Сказ (8 гадзін)

Параўнанне слова і сказа. Закончаная думка ў сказе.

Сказы апавядальныя, пытальныя, пабуджальныя. Клічныя сказы.

Змест і інтанацыя сказаў. Знакі прыпынку ў канцы сказа.

Упарадкаванне дэфармаваных сказаў.

Складанне сказаў розных відаў па малюнку[1].

Выражэнне вучнямі сваёй закончанай думкі ў размове аб надвор'і.

Тэкст (8 гадзін)

Паняцце аб тэксце. Прыметы тэксту: тэма і асноўная думка, загаловак. Сувязь сказаў у тэксце. Афармленне тэксту на пісьме.

Упарадкаванне дэфармаванага тэксту.

Складанне невялікага тэксту з 3–4 сказаў пра сяброў[1].

Паўтарэнне вывучанага за год (5 гадзін)

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ VI КЛАСА

Вучні маюць уяўленні:

аб значэнні беларускай мовы для народа і краіны;

асноўных характарыстыках гукаў беларускай мовы;

ролі націску ў размежаванні значэнняў слоў;

складзе слова;

катэгорыях роду і ліку назоўнікаў, прыметнікаў, дзеясловаў;

відах сказаў;

асноўных прыметах тэксту, афармленні тэксту на пісьме;

уменні:

адрозніваць галосныя і зычныя гукі; націскныя і ненаціскныя галосныя гукі; цвёрдыя і мяккія, звонкія і глухія, падоўжаныя і зацвярдзелыя зычныя гукі;

вылучаць словы з аднолькавым або падобным гучаннем і напісаннем, але розным значэннем у рускай і беларускай мовах;

размяжоўваць слова і сказ;

правільна пісаць прыназоўнікі з назоўнікамі;
змяняць словы з дапамогай канчатка.
Вучні ведаюць і прымяняюць:
вялікую літару ў пачатку слоў і сказаў;
роднасныя словы падчас маўлення;
беларускі алфавіт для запісу слоў у правільным парадку;
знакі прыпынку для перадачы патрэбнай інтанацыі ў канцы сказа.
Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай рабоце:
разуменне аднакаранёвых слоў;
размежаванне слоў, блізкіх або процілеглых па значэнні;
прымяненне алфавіта падчас работы са слоўнікам;
выкарыстанне дыялогу і маналогу;
чытанне сказаў з патрэбнай інтанацыяй;
вызначэнне тэмы і асноўнай думкі тэксту;
складанне сказаў па малюнку, апісанні.
Вучні валодаюць сацыякультурнымі ўменнямі:
адрозніваць сітуацыі ўжывання беларускай мовы;
разумець асаблівасці беларускай мовы пры слуханні, гаварэнні, чытанні і пісьме;
ужываць беларускія этыкетныя маўленчыя выразы;
выражаць закончаную думку ў размове пра надвор'е, сяброў;
чытаць выразна і пераказваць невялікі тэкст.

VII клас

Паўтарэнне (8 гадзін)

Асаблівасці беларускай мовы.

Удзел у дыялогу з ужываннем ветлівых слоў (прывітанне, развітанне, віншаванне, удзячнасць, прабачэнне, пажаданне).

Маўленне (8 гадзін)

Мова і маўленне. Родная мова – вялікі скарб беларускага народа. Значэнне маўлення ў жыцці чалавека. Маўленчы этыкет.

Вуснае маўленне. Правілы вуснага маўлення. Выкарыстанне ў зносінах мімікі і жэстаў.

Пісьмовае маўленне.

Суразмоўніцтва на тэму «Школа»[1].

Успрыманне на слых маўлення людзей у тэлеперадачах.

Гукі і літары (8 гадзін)

Галосныя гукі і іх літары. Націск.

Зычныя гукі і іх літары. Цвёрдыя, мяккія, зацвярдзелыя зычныя гукі. Абазначэнне мяккасці зычных на пісьме літарамі і, я, е, ё, ю, ь. Звонкія і глухія зычныя гукі. Падоўжаныя зычныя.

Гука-літарны аналіз слова.

Правапіс о, э–а; е, ё–я.

Правапіс д–дз, т–ц.

Правапіс літар звонкіх і глухіх зычных гукаў (у канцы і ў сярэдзіне слова перад глухімі).

Напісанне апострафа і раздзяляльнага мяккага знака.

Складанне слоў на правапіс о, э–а; е, ё–я або д–дз, т–ц.

Слова (26 гадзін)

Значэнне слова (3 гадзіны)

Словы, блізкія па значэнні. Словы, процілеглыя па значэнні. Тлумачальны слоўнік.

Часткі слова (4 гадзіны)

Роднасныя словы. Корань слова. Канчатак і яго роля ў сувязі слоў. Формы слова. Прыстаўка. Суфікс. Утварэнне слоў з дапамогай суфіксаў і прыставак. Вызначэнне частак слова.

Часціны мовы (1 гадзіна)

Назоўнік, дзеяслоў, прыметнік. Распазнаванне іх у сказе.

Назоўнік (6 гадзін)

Значэнне і роля ў сказе. Лік, род назоўнікаў. Назоўнікі, блізкія і процілеглыя па сэнсе.

Правапіс вялікай літары ў словах. Хатні адрас. Адрас школы.

Дзеяслоў (6 гадзін)

Значэнне і роля ў сказе. Дзеясловы, блізкія і процілеглыя па сэнсе. Сувязь дзеясловаў з назоўнікамі з дапамогай пытанняў.

Час дзеяслова (практычнае выкарыстанне).

Правапіс не з дзеясловамі.

Прыметнік (5 гадзін)

Значэнне і роля ў сказе. Прыметнікі, блізкія і процілеглыя па значэнні. Сувязь прыметнікаў з назоўнікамі з дапамогай пытанняў.

Прыназоўнік (1 гадзіна)

Правапіс прыназоўніка са словамі.

Складанне слоў у адпаведнасці з прапанаванымі схемамі (з апорай на малюнкі)[1].

Ужыванне слоў розных часцін мовы ў маўленні.

Сказ (7 гадзін)

Закончаная думка ў сказе. Паслядоўнасць слоў у сказе. Дапаўненне сказа словамі па сэнсе.

Віды сказаў паводле мэты выказвання. Віды сказаў па інтанацыі.

Галоўныя члены сказа. Дзейнік і выказнік. Даданыя члены сказа (без падзелу на віды). Сувязь слоў у сказе. Дапаўненне сказаў даданымі членамі.

Складанне сказаў па пытаннях, малюнках. Складанне клічных сказаў[1].

Формулы ветлівасці ў сказах.

Тэкст (7 гадзін)

Адрозненне звязнага тэксту ад асобных сказаў. Віды тэкстаў (вершаваны, празаічны; дыялог, маналог). Межы сказаў у тэксце.

Пабудова тэксту з асобных сказаў. Паслядоўнасць сказаў у тэксце.

Часткі тэксту (пачатак, асноўная частка, канцоўка.). Чырвоны радок. Падзел тэксту на часткі. План тэксту. Вусны пераказ невялікага тэксту па плане.

Аб’ява.

Падбор загалоўка да тэксту. Вызначэнне адпаведнасці прапанаванага загалоўка тэксту[1].

Адрозненне вершаваных і празаічных тэкстаў на ўроках літаратурнага чытання.

Паўтарэнне вывучанага за год (6 гадзін)

Складанне невялікіх тэкстаў пра надвор’е[1].

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ VII КЛАСА

Вучні маюць уяўленні:
аб правілах вуснага маўлення;
правапісе звонкіх і глухіх гукаў беларускай мовы;
відах сказаў паводле мэты выказвання і інтанацыі;
галоўных і даданых членах сказа;
відах тэксту;
уменні:
правільна вымаўляць гукі беларускай мовы;
вызначаць часткі слова;
абазначаць цвёрдасць-мяккасць зычных на пісьме;
правільна пісаць апостраф і раздзяляльны мяккі знак;
правільна пісаць прыназоўнік з самастойнымі часцінамі мовы.
Вучні ведаюць і прымяняюць:
размежаванне падобных і процілеглых па значэнні слоў падчас маўлення;
спосабы ўтварэння новых слоў з дапамогай суфіксаў і прыставак;
міміку і жэсты ў зносінах.
Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай рабоце:
складанне дыялогу і маналогу;
вымаўленне сказаў з патрэбнай інтанацыяй;
складанне плана тэксту і пераказ невялікага тэксту па плане;
вызначэнне тэмы, асноўнай думкі тэксту;
складанне тэкстаў з асобных сказаў, падбор да іх загалоўкаў.
Вучні валодаюць сацыякультурнымі ўменнямі:
выкарыстоўваць маўленчы этыкет;
успрымаць на слых беларускае маўленне па тэлебачанні;
выразна і правільна чытаць невялікі, даступны для разумення тэкст;
ствараць невялікі аповед на зразумелыя тэмы (пра школу, надвор’е), пісаць невялікую аб’яву.

VIII клас

Паўтарэнне (6 гадзін)

Галосныя гукі і іх літары. Зычныя гукі і іх літары. Гука-літарны разбор слова.
Адметныя асаблівасці беларускай мовы.
Складанне слоў на зацвярдзелыя гукі[1].
Практычнае карыстанне даведнікамі з алфавітным указальнікам.

Маўленне (6 гадзін)

Вуснае і пісьмовае маўленне. Асаблівасці пісьмовага маўлення. Дыялагічнае і маналагічнае маўленне. Празаічнае і паэтычнае маўленне.
Маўленчы этыкет.
Складанне кароткіх маналогаў пра сябе, сваю сям’ю[1].
Вылучэнне сказаў з вуснага маўлення.

Слова (34 гадзіны)

Лексічнае значэнне слова (4 гадзіны)

Сінонімы. Антонімы.

Часткі слова (4 гадзіны)

Корань. Канчатак. Суфікс. Прыстаўка. Роднасныя словы і формы слова.

Часціны мовы (26 гадзін)

Назоўнік (8 гадзін)

Род і лік назоўнікаў. Склоны назоўніка, склонавыя пытанні. Скланенне назоўнікаў адзіночнага і множнага ліку.

Прыметнік (7 гадзін)

Род і лік прыметнікаў. Дапасаванне прыметнікаў да назоўнікаў. Змяненне прыметнікаў адзіночнага і множнага ліку.

Займеннік (3 гадзіны)

Агульнае паняцце пра займеннік. Роля асабовых займеннікаў у маўленні.

Дзеяслоў (8 гадзін)

Лік дзеяслова. Час дзеяслова. Змяненне дзеясловаў па часах.

Складанне ланцужкоў роднасных слоў з розных часцін мовы[1].

Ужыванне сінонімаў і антонімаў у гутарцы «Што я люблю».

Сказ (10 гадзін)

Віды сказаў па мэце выказвання і па інтанацыі. Змест і інтанацыя пытальных і клічных сказаў.

Галоўныя і даданыя члены сказа.

Аднародныя члены сказа. Знакі прыпынку і інтанацыя ў сказах з аднароднымі членамі.

Складанне сказаў па пытаннях на тэму «Любімая пара года»[1].

Практыкаванне ў пастаноўцы знакаў прыпынку па зададзенай у сказе інтанацыі.

Тэкст (8 гадзін)

Прыметы тэксту. Структура тэксту: пачатак, асноўная частка, канцоўка. Выдзяленне асноўных частак тэксту. План тэксту.

Пераказ тэксту па плане з дапамогай пытанняў, па апорных словах.

Стварэнне тэксту па серыі малюнкаў[1].

Напісанне паштоўкі, ліста да сяброў.

Паўтарэнне вывучанага за год (6 гадзін)

Вуснае складанне кароткага апавядання «Хутка летнія канікулы»[1].

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ VIII КЛАСА

Вучні маюць уяўленні:

аб празаічным і паэтычным маўленні;

маўленчым этыкеце;

аднародных членах сказа;

сінаніміі і антаніміі;

частках слова і формах слова;

уменні:

вызначаць граматычныя катэгорыі назоўніка, прыметніка, дзеяслова, займенніка;

правільна ставіць знакі прыпынку пры аднародных членах сказа;

вылучаць структурныя часткі тэксту (пачатак, асноўная частка, канцоўка).

Вучні ведаюць і прымяняюць:

сродкі выразнасці вуснага маўлення (гучнасць, тэмп, тон, дыкцыя, паўза, лагічны націск, інтанаванне, эмацыянальная афарбоўка голасу) пры пабудове тэксту;

правілы пастаноўкі знакаў прыпынку ў адпаведнасці з інтанацыяй;

змяненне назоўнікаў, прыметнікаў, дзеясловаў;

правілы маўленчага этыкету.

Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай рабоце:

разуменне роднасных слоў розных часцін мовы;

размежаванне сінонімаў і антонімаў;

вылучэнне асноўных частак тэксту;

стварэнне тэксту па малюнку, пытаннях, апорных словах;

пераказ тэксту па плане з дапамогай пытанняў, па апорных словах.

Вучні валодаюць сацыякультурнымі ўменнямі:

карыстацца крыніцамі з алфавітным указальнікам;

выкарыстоўваць маўленчы этыкет;

складаць план тэксту;

складаць невялікі вусны аповед пра сябе, сваю сям'ю, школьныя канікулы, любімую пару года;

пісаць невялікі ліст да родных, сяброў, віншавальную паштоўку.

IX клас

Паўтарэнне (6 гадзін)

Маўленне. Формы і віды маўлення. Правілы вуснага і пісьмовага маўлення. Культура маўленчых зносін паміж людзьмі.

Удзел у дыялогах побытавага характару (вучоба, здароўе, адпачынак)[1]. Размова па тэлефоне[1].

Маўленчыя нормы этыкету ў паўсядзённым жыцці.

Слова (34 гадзіны)

Значэнне слова (4 гадзіны)

Адназначныя і мнагазначныя словы. Прамое і пераноснае значэнне слова.

Часткі слова (6 гадзін)

Аднакаранёвыя словы і формы слова. Правапіс прыставак аб-, ад-, над-, пад-, з-, с-. Апостраф пасля прыставак. Адрозненне прыстаўкі ад прыназоўніка.

Часціны мовы (24 гадзіны)

Назоўнік (6 гадзін)

Скланенне назоўнікаў. Правапіс склонавых канчаткаў назоўнікаў (на практычным узроўні з апорай на табліцы).

Прыметнік (5 гадзін)

Правапіс склонавых канчаткаў прыметнікаў (на практычным узроўні з апорай на табліцы).

Займеннік (3 гадзіны)

Змяненне асабовых займеннікаў па склонах (на практычным узроўні з апорай на табліцы). Правапіс займеннікаў з прыназоўнікамі.

Дзеяслоў (6 гадзін)

Змяненне дзеясловаў па асобах і ліках у цяперашнім і будучым часе. Азнаямленне з асабовымі канчаткамі дзеясловаў (на практычным узроўні з апорай на табліцы). Лік і род дзеясловаў у прошлым часе.

Лічэбнік (2 гадзіны)

Агульнае значэнне. Роля лічэбніка ў мове. Колькасныя і парадкавыя лічэбнікі.

Прыслоўе (2 гадзіны)

Агульнае паняцце, роля ў сказе. Значэнне прыслоўяў, пытанні да іх.

Дапаўненне тэкстаў-апісанняў прыметнікамі[1].

Ужыванне дзеясловаў розных часоў у паведамленні пра сябе.

Сказ (12 гадзін)

Сказ і яго будова. Галоўныя і даданыя члены сказа. Просты і складаны сказ. Сказ з аднароднымі членамі. Знакі прыпынку пры аднародных членах сказа. Злучнікі пры аднародных членах.

Зваротак. Знакі прыпынку пры звароткy.

Моўнае ўзаемадзеянне ў працэсе працы на ўроку з ужываннем звароткаў у маўленні[1].

Дапаўненне дыялогаў сказамі – адказамі на тэму «Сям'я».

Тэкст (12 гадзін)

Вызначэнне асноўнай думкі тэксту рознымі спосабамі. Структура тэксту. Пачатак тэксту, асноўная частка, канцоўка. Падзел тэксту на часткі.

Пераказ тэксту па калектыўна складзеным плане.

Тыпы тэкстаў: апавяданне, апісанне, разважанне. Пераклад тэкстаў з рускай мовы на беларускую.

Стварэнне тэкстаў па сюжэтным малюнку з дапамогай пытанняў[1].

Дзелавыя паперы: распіска, даверанасць.

Паўтарэнне вывучанага за год (6 гадзін)

Складанне тэксту на тэму «Мае мары»[1].

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ IX КЛАСА

Вучні маюць уяўленні:

аб маўленчым этыкеце;

адназначных і мнагазначных словах;

правапісе прыставак;

катэгорыі часу дзеяслова;

граматычных характарыстыках лічэбнікаў і прыслоўяў;

аднародных членах сказа, звароткy;

структурных частках тэксту;

тыпах тэкстаў;

уменні:

правільна змяняць назоўнікі, прыметнікі, дзеясловы і займеннікі;

правільна расстаўляць знакі прыпынку пры аднародных членах сказа, пры звароткy;

размяжоўваць простыя і складаныя сказы.

Вучні ведаюць і прымяняюць:

прамое і пераноснае значэнні слоў у маўленні;

дапасаванне прыметніка да назоўніка ў сказах;

ужыванне зваротка падчас вуснага і пісьмовага маўлення.

Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай рабоце:

адрозненне адназначных і мнагазначных слоў;

размежаванне прамога і пераноснага значэння слоў;

пераклад невялікага тэксту з рускай мовы на беларускую;

пераказ тэксту па плане;

складанне вуснага і пісьмовага тэксту для пераказу сюжэта.

Вучні валодаюць сацыякультурнымі ўменнямі:

удзельнічаць у побытавых дыялогах;

размаўляць па тэлефоне;

выкарыстоўваць беларускую мову пры напісанні тэкстаў дзелавога характару (аб'ява, распіска);

умець расказаць пра сябе, сваіх сяброў, свае мары.

X клас

Паўтарэнне (4 гадзіны)

Значэнне слова. Часткі слова. Разбор слоў па саставе.

Практычнае карыстанне тлумачальным і перакладнымі слоўнікамі.

Сітуацыі ўжывання беларускіх прыказак, прымавак, пацешак у паўсядзённым жыцці[1].

Правілы этыкету ва ўзаемаадносінах са знаёмымі і незнаёмымі людзьмі.

Часціны мовы (15 гадзін)

Назоўнік, прыметнік, займеннік, дзеяслоў (граматычныя прыметы) (11 гадзін)

Знаходжанне слоў розных часцін мовы ў сказе. Дапаўненне сказаў рознымі часцінамі мовы. Змяненне часцін мовы.

Лічэбнік (2 гадзіны)

Агульнае значэнне, пытанні да яго. Правапіс некаторых лічэбнікаў.

Прыслоўе (2 гадзіны)

Значэнне прыслоўяў, пытанні да іх.

Складанне сказаў на прапанаваную тэму з ужываннем розных часцін мовы[1].

Складанне дзелавых папер з ужываннем лічэбнікаў і прыслоўяў.

Сказ (6 гадзін)

Галоўныя і даданыя члены сказа.

Просты і складаны сказ. Коска ў складаных сказах.

Злучнікі паміж часткамі складанага сказа.

Знакі прыпынку пры аднародных членах сказа.

Зваротак. Знакі прыпынку пры звароткү.

Тэкст (6 гадзін)

Прыметы тэксту. Вызначэнне тэмы і асноўнай думкі тэксту. Загаловак тэксту.

Структура тэксту. Тыпы тэкстаў.

Складанне плана тэксту. Пераказ тэксту па плане.

Пераклад тэкстаў з рускай мовы на беларускую (і наадварот).

Складанне тэкстаў-апавяданняў па пытаннях[1]. Складанне тэкстаў-апісанняў па малюнках[1].

Дзелавыя паперы: заява, аўтабіяграфія, анкета.

Паўтарэнне вывучанага за год (4 гадзіны)

Вуснае складанне тэксту пра будучую прафесію[1].

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ X КЛАСА

Вучні маюць уяўленні:

аб лексічным значэнні слова;

простым і складаным сказе;

аднародных членах сказа і звароткү;

граматычных характарыстыках вывучаных часцін мовы;

структурных частках тэксту, тыпах тэкстаў;

уменні:

змяняць часціны мовы;

ужываць лічэбнікі і прыслоўі;

разбіраць словы па саставе;

правільна расстаўляць знакі прыпынку ў простых і складаных сказах.

Вучні ведаюць і прымяняюць:
правілы пастаноўкі косак і злучнікаў паміж часткамі складанага сказа;
правілы пастаноўкі знакаў прыпынку пры аднародных членах сказа і пры зваротку;
афармленне тэксту на пісьме.
Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай рабоце:
прымяненне сказаў з рознымі часцінамі мовы;
складанне плана і пераказ тэксту, падбор загалоўка;
пераклад тэкстаў з рускай мовы на беларускую (і наадварот);
складанне тэкстаў розных тыпаў па малюнках і пытаннях;
карыстанне тлумачальным і перакладнымі слоўнікамі.
Вучні валодаюць сацыякультурнымі ўменнямі:
захоўваць нормы маўленчага этыкету;
ужываць беларускія прыказкі, прымаўкі, пацешкі ў паўсядзённым жыцці;
складаць дзелавыя паперы (заява, аўтабіяграфія, анкета);
ствараць аповед на тэмы, блізкія да жыцця і будучай працоўнай дзейнасці.